# НАША МОВА БУДЗЕ ЖЫЦЬ

У кожнага чалавека ёсць свая родная мова. Для сапраўднага беларуса яна беларуская. Менавіта пра гэта гаварылі падчас імпрэзы «Свята роднай мовы» ў Віцебскай абласной бібліятэцы 22 лютага. Арганізавалі мерапрыемства супрацоўнікі бібліятэкі і Віцебская абласная рада Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны.

Мне і маім сяброўкам Дашы Андрыца і Лізе Ежгуровай пашчасціла прымаць удзел у гэтым свяце. Мы чыталі на памяць любімыя вершы беларускіх класікаў і слухалі нашых сучаснікаў – віцебскіх творцаў Міхася Мірановіча, Мар'яна Даргеля, Людмілу Сіманёнак. Але галоўнай падзеяй вечара стала напісанне X Агульнанацыянальнай дыктоўкі. Старшыня Віцебскай абласной арганізацыі ТБМ, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства нашага ўніверсітэта Юрый Бабіч прапанаваў урывак з апавядання «Усмешка» сёлетняга юбіляра Янкі Брыля. Напрыканцы імпрэзы з музычным нумарам выступіў дуэт Аліны Таргунакавай і Генадзя Емяльянава.

Свята ў бібліятэцы сабрала сапраўдных аматараў беларускай мовы. І гэта цудоўна, калі людзі прыходзяць на такія мерапрыемствы, дзе можна адпачыць душой. А я ў чарговы раз упэўнілася ў тым, што наша мова будзе жыць.

**Крысціна ДАЙЛІДЗЁНАК,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**